# 2024 г. - 85 гадоў установе «Рэдакцыя раённай газеты «Кобрынскі веснік» (1939)

Газета «Кобрынскі веснік» вядзе сваю гісторыю з верасня 1939 года, які прайшоў на хвалі працэсаў аб’яднання Заходняй Беларусі з БССР. Чырвоная Армія вызваліла Кобрын ад белапалякаў 22 верасня 1939 года, а ўжо праз пяць дзён выйшаў першы нумар газеты «Труд» - орган часовага ўпраўлення горада Кобрына і Кобрынскага павета.

Выдавалася газета «Труд» на рускай мове, друкавалася на ручным станку. Першым рэдактарам газеты быў Сцяпан Сяргеевіч Чэпікаў, які прыбыў у Кобрын разам з чырвонаармейскімі часцямі. Дапамагалі выдаваць першыя нумары газеты рускі паэт Аляксандр Твардоўскі і пісьменнік Барыс Гарбатаў, якія пасля вызвалення Заходняй Беларусі некаторы час жылі ў Кобрыне, дзе размяшчаўся штаб 4-й арміі. У памяць аб гэтым у 1986 годзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка (вул. Суворава, 1).

Газета «Труд» стала рупарам таго новага, што пранікала ў жыццё заходніх беларусаў. Але гэты стваральны працэс на тры доўгія гады спыніла Вялікая Айчынная вайна. Апошні перадваенны нумар газеты выйшаў 20 чэрвеня 1941 года. На жаль, быў страчаны і газетны архіў «Труда». І толькі па асобных нумарах, цудам ацалелых, ды па ўспамінах старажылаў сёння можна меркаваць аб удзеле і ролі газеты ў жыцці Кобрыншчыны перадваеннага часу.

Выданне газеты «Труд» аднавілася праз месяц пасля вызвалення горада і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 23 жніўня 1944 года выйшаў першы, яшчэ малафарматны, нумар. І першыя яе артыкулы адразу ставілі важнейшыя задачы - аднавіць школы раёна, адрадзіць Кобрын.

З 25 чэрвеня 1953 года газета стала выдавацца на беларускай мове пад назвай «Праца». З 28 красавіка 1962 года «Праца» становіцца газетай Брэсцкага абкама КПБ і абласнога Савета дэпутатаў працоўных пры Кобрынскім тэрытарыяльна-вытворчым калгасна-саўгасным упраўленні і атрымлівае назву «Камуністычная праца». Нягледзячы на значную ідэалагічную зашоранасць, працягвала лепшыя традыцыі «Труда» – шмат пісала пра людзей, іх намаганні зрабіць лепшым, дастойным сваё жыццё, падняць культуру, выхоўваць здаровае і адукаванае падрастаючае пакаленне.

У адпаведнасці з Законам СССР ад 12 чэрвеня 1990 года «Аб друку» газета «Камуністычная праца» перайменавана ў «Кобрынскі веснік». Першы нумар пад такой назвай выйшаў 1 студзеня 1991 года. Заснавальнікам газеты з'яўляліся Кобрынскі гарадскі і раённы Саветы народных дэпутатаў. Размясцілася рэдакцыя газеты па адрасе: вуліца Савецкая, 14.

Згодна пасведчання аб рэгістрацыі № 677 ад 30 снежня 2006 года Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь газета зарэгістравана як установа «Рэдакцыя раённай газеты «Кобрынскі веснік» і праграмы радыёвяшчання «Кобрынскае раённае радыё». Заснавальнікі: Кобрынскі раённы Савет дэпутатаў і Кобрынскі раённы выканаўчы камітэт. З 2023 года установа змяніла назву – «Рэдакцыя раённай газеты "Кобрынскі веснік"». Выдавалася на беларускай і рускай мовах на 8-мі палосах у сераду і 12-ці – у суботу. У 2009 годзе створаны сайт газеты, які сістэматычна напаўняецца актуальным кантэнтам.

З 2024 года газета «Кобрынскі веснік» выходзіць адзін раз у тыдзень на 20 палосах. У фармаце газеты выходзяць спецыялізаваныя тэматычныя выпускі, пастаянныя рубрыкі рознай накіраванасці, новыя праекты, якія разлічаны на рознаўзроставую аўдыторыю чытачоў. Павялічваецца колькасць навінаў, злабадзённых, крытычных матэрыялаў. Па меры апублікавання крытычных матэрыялаў рэдакцыя газеты «Кобрынскі веснік» забяспечвае рэагаванне па сутнасці зваротаў грамадзян.

За час існавання газеты галоўнымі рэдактарамі яе былі: Пётр Міхайлавіч Дамброўскі (1958-1981), Аркадзій Віктаравіч Астаповіч (1981-2002), Алена Мікалаеўна Жук (2002-2008), Аляксей Максімавіч Пянко (2009-2014), Раман Васільевіч Мельнік (2014-2024). Са жніўня 2024 года газету ўзначальвае Вольга Андрэеўна Белазерская. Калектыў рэдакцыі налічвае 13 чалавек.

Газета «Кобрынскі веснік» - масава-палітычная газета, у полі зроку якой знаходзіцца ўвесь спектр жыццядзейнасці раёна і краіны. У супрацоўнікаў газеты шмат цікавых планаў.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат.
аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Пянко, А. М.** «Кобрынскі веснік» / А. М. Пянко // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 484.

**«Камуністычная** праца», газета, орган Кобрынскага РК КПБ і раённага Савета народных дэпутатаў // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1980. – Т. 3. - С. 258.

**«Камуністычная** праца», газета, орган Кобринского РК КПБ и районного Совета народных депутатов // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1980. – Т. 3. - С. 250.

**Астаповіч, А.** На ўсё жыццё / Аркадзь Астаповіч // Нашчадкам слова застаецца. – Брэст, 2001. - С. 81-82.

Аб газеце «Кобрынскі веснік».

**Гісторыя** газетным радком. Па старонках кобрынскай раённай газеты // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 421-426.

**Куцэра, Г. Д.** Карэспандэнты «Камуністычнай працы» / Г. Д. Куцэра // Раённая ў пошуку. - Мінск, 1974. – С. 81-82.

**Канапацкая Таццяна Васільеўна** // Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі : біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. - Брэст, 2018. - С. 84, 85.

Канапацкая Т. В. працавала адказным сакратаром ў раённай газеце «Камуністычная праца».

**Установе** «Рэдакцыя раённай газеты «Кобрынскі веснік» (1939) – 85 гадоў // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 143-144.

**Главный** критерий работы — правда / соб. инф. // Кобрынскі веснік. - 2024. — 8 чэрвеня (№ 23). — С. 5 : фот.

Корреспондент районной газеты "Кобрынскі веснік" Дмитрий Белов принял участие в форуме "Белая Русь — медиа".

**Бакун, Е.** Беларусь — многолика / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 23 верасня (№ 60). — С. 13 : фот.

Победителем республиканского конкурса среди журналистов и СМИ стала районная газета "Кобрынскі веснік", удостоившаяся диплома III степени.

**Белов, Д.** Работать с аудиторией эффективно: в Минске прошел профсоюзный медиафорум / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов и из архива участников форума // Кобрынскі веснік. - 2023. — 16 снежня (№ 72). — С. 5 : фот.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" Дмитрий Белов принял участие в VI республиканском медиафоруме "Инновационные инструменты работы в СМИ".

**Соловей, А.** Дорогу молодым журналистам! / Александра Соловей ; фото: из архива редакции // Кобрынскі веснік. - 2023. — 23 снежня (№ 73). — С. 7 : фот.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" Александра Соловей и блогер Павел Дмитриев приняли участие в X форуме молодых журналистов.

**Соловей, А.** "Семь-Я. Гомельщина гостеприимная" / Александра Соловей ; фото: Александра Соловей // Кобрынскі веснік. - 2023. — 26 жніўня (№ 56). — С. 5 : фот.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" Александра Соловей и блогер Павел Дмитриев принимали участие в республиканском пресс-туре "Семь-Я. Гомельщина гостеприимная".

**Успех** любит настойчивых // Кобрынскі веснік. - 2023. — 27 мая (№ 38). — С. 10 : фот.

Корреспондент районной газеты "Кобрынскі веснік" Жанна Елизарова — среди победителей областного соревнования редакций областных, объединенных, районных и городских газет, телевидения и радио, журналистов.

**Бакун, Е.** Есть такое слово "надо" / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2021. — 31 снежня (№ 102). — С. 10 : фот.

Накануне 75-летнего юбилея бывший бухгалтер районной газеты "Кобрынскі веснік" Людмила Федоровна Аносова рассказала о своем трудовом пути.

**Золото** для "районки" // Кобрынскі веснік. - 2020. — 30 снежня (№ 100). — С. 3.

Коллектив газеты "Кобрынскі веснік" завоевал четыре престижных диплома.

**Бакун, А.** Мэта — служыць чытачу / Алена Бакун // Заря. - 2019. — 25 верасня. — С. 1, 2, 3 : фот.

Газеце "Кобрынскі веснік" — 80 гадоў.

**Бакун, Е.** С очередной наградой "Кобрынскі веснік"! / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. – 2019. – 21 снежня (№ 99). – С. 4.

Коллективу авторов газеты "Кобрынскі веснік" присужден диплом победителя республиканского конкурса “От глобальных целей к локальным действиям.

**Бялоў, Д.** Разам назаўжды! / Дмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2019. — 23 сакавіка. — С. 7.

**Дмитрий** Белов — номинант республиканского конкурса Министерства внутренних дел Республики Беларусь // Кобрынскі веснік. - 2019. — 18 мая. — С. 10.

**Пашкевич, А.** История, люди, дела / Алина Пашкевич // Заря. - 2019. — 27 апреля. — С. 5.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" Л. Пашкович — среди лауреатов областного творческого конкурса.

**Феерверк** узнагарод // Кобрынскі веснік. - 2019. — 27 сакавіка. — С. 3.

Галоўны рэдактар газеты "Кобрынскі веснік" — сярод пераможцаў абласнога творчага конкурсу.

**Шустович, И.** Диалог с молодежью / Инна Шустович // Кобрынскі веснік. - 2019. — 21 верасня. — С. 4 : фот.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" К. Онизар получила награду областного форума журналистов "Слово молодых".

**Ад «Труда»** да «Кобрынскага весніка» // Кобрынскі веснік. - 2018. — 13 кастрычніка. — С. 4.

Гісторыя газеты «Кобрынскі веснік».

**Бакун, Е**. Когда душа тянется к солнцу / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 13 кастрычніка. — С. 9.

С 1973 г. по 1995 г. М. Гателюк работала корректором в редакции газеты.

**Бялоў, Д.** Лепшы матэрыял аб пошце — у Алены Бакун / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2018. — 31 сакавіка. — С. 3.

Карэспандэнт газеты «Кобрынскі веснік» А. Бакун — сярод пераможцаў абласнога конкурсу «Лепшы матэрыял аб пошце-2017».

**Мельнік, Р**. Мы разам / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2018. — 13 кастрычніка. — С. 4.

Выйшаў 10 000-ы юбілейны нумар газеты «Кобрынскі веснік».

**Пашкович, Л.** У "Кобрынскага весніка" новые награды / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 11 ліпеня. — С. 4.

Корреспонденты газеты "Кобрынскі веснік" — среди победителей областного конкурса.

**Поздравляем** с заслуженной победой! // Кобрынскі веснік. - 2018. — 27 кастрычніка. — С. 2.

Корреспондент газеты «Кобрынскі веснік» Е. Бакун — среди победителей республиканского творческого конкурса.

**Белов, Д.** Журналист "КВ" - в числе победителей! / Дмитрий Белов ; фото Романа Мельника // Кобрынскі веснік. - 2016. — 20 студзеня (№ 6). — С. 2 : фот.

Журналист "КВ" Людмила Дубина — в числе победителей творческого конкурса РУП "Белпочта".

**Чарговая** ўзнагарода — у Дзмітрыя Бялова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 13 кастрычніка. — С. 4.

**Мельнік, Р.** І зноў "КВ" з узнагародай! / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2017. — 26 ліпеня. — С. 2.

Калектыў рэдакцыі "Кобрынскі веснік" атрымаў дыплом II ступені рэспубліканскага творчага конкурсу на лепшае асвятленне інфармацыі дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях.

**Новыя** перамогі на абласным узроўні! // Кобрынскі веснік. - 2017. — 1 ліпеня. — С. 3.

Двума прэстыжнымі дасягненнямі папоўнілася скарбонка "Кобрынскага весніка" на абласных спаборніцтвах.

**Сорокин, В.** Урожай на медийном поле / Влад Сорокин // Заря. - 2017. — 22 июня. — С. 6.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" Д. Белов — среди победителей в персональных номинациях XIII областного соревнования журналистов Брестчины.

**Белов, Д.** Журналист "КВ" - в числе победителей! / Дмитрий Белов ; фото Романа Мельника // Кобрынскі веснік. - 2016. — 20 студзеня (№ 6). — С. 2 : фот.

Журналист "КВ" Людмила Дубина — в числе победителей творческого конкурса РУП "Белпочта".

**Міхалевіч, Г.** Заахвочваць землякоў да добрых спраў і думак / Галіна Міхалевіч // Народная трыбуна. - 2016. — 27 мая. — С. 3.

Рэдакцыя газеты "Кобрынскі веснік" - сярод лаўрэатаў штогадовага абласнога спаборніцтва рэдакцый абласных, аб`яднаных, гарадскіх, і раённых газет.

**На республиканском** уровне // Кобрынскі веснік. - 2016. — 4 чэрвеня. — С. 3.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" Д. Белов награжден дипломом республиканского конкурса за лучшее освещение в СМИ деятельности органов внутренних дел.

**Пашковіч, Л.** Калі яднае журналістыка / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 18 мая. — С. 2.

Газета "Кобрынскі веснік" была прадстаўлена на спецыялізаванай выстаўцы "СМІ ў Беларусі".

**Пашковіч, Л.** У "раёнкі" - новая ўзнагарода / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. — 24 лютага. — С. 4.

Рэдакцыя газеты "Кобрынскі веснік" заняла другое месца ў абласным творчым конкурсе на лепшае асвятленне ў сродках масавай інфармацыі дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях РБ.

**Соловьев, Е**. ...И пусть не покидает вдохновение! / Евгений Соловьев // Заря. - 2016. — 24 мая. — С. 4.

Газета "Кобрынскі веснік" - среди призеров областного творческого соревнования редакций СМИ.

**У "КВ"** - новый диплом! // Кобрынскі веснік. - 2016. — 16 красавіка. — С. 3.

Корреспондент газеты "Кобрынскі веснік" Л. Дубина стала дипломантом журналистского конкурса "Самый необычный родник региона".

**Ярмалюк, Л.** Кобрынскі веснік" - лепшая газета / Людміла Ярмалюк // Кобрынскі веснік. - 2016. — 28 мая. — С. 3.

Рэдакцыя газеты "Кобрынскі веснік" - сярод лаўрэатаў штогадовага абласнога творчага спаборніцтва рэдакцый СМІ.

**Дубина, Л.** Ряды наших читателей пополняет молодёжь / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2015. — 28 лютага. — С. 2

Сотрудники редакции газеты "Кобрынскі веснік" провели традиционные дни подписчика.

**Мельнік, Р.** Будзем сябраваць / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2014. — 24 мая. — С. 1.

Новы рэдактар Р. Мельнік – аб перспектывах развіцця газеты.

**Мельнік, Р.** "КВ" пашырае фармат / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2014. — 24 снежня. — С. 1.

**Роднай** газеце - 75 : з "раёнкай" па жыцці // Кобрынскі веснік. - 2014. — 24 верасня. — С. 1-3.

**Мельнік, Р.** Сучаснасць у віртуальнай прасторы / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2013. — 20 красавіка. — С. 2.

Сайту газеты "Кобрынскі веснік" у сакавіку споўнілася чатыры гады.

**Томашевич, Г**. Искусство газетной полосы : профессиональная учёба / Георгий Томашевич // Заря. - 2013. — 30 марта. — С. 3.

"Районная газета сегодня и завтра" - эта тема стала предметом очередной межрайонной летучки журналистов, в которой приняли участие журналисты газеты "Кобрынскі веснік".

**Мороз, Е.** Слово молодым и... талантливым! / Евгения Мороз // Заря. - 2010. - 30 декабря. - С. 19 ; Кобрынскі веснік. - 2011. - 1 студзеня. - С. 3.

Победителем областного журналистского конкурса стал корреспондент из Кобрина Роман Мельник.

**Пянко, А**. Кожны нумар нясе пазітыў / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2010. - 12 чэрвеня. - С. 1, 2.

Аб газеце "Кобрынскі веснік".

**Пянко, А.** Улада і прэса - канструктыўны дыялог / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2010. - 24 лютага. - С. 1, 2 ; Вечерний Брест. - 2010. – 24 февраля. - С. 2.

У Кобрыне адбылося падвядзенне вынікаў спаборніцтва сярод журналістаў, на якім газета "Кобрынскі веснік" адзначана Дыпломам.

**"Раёнка"** ў лёсе тваім і маім : з юбілеем, родная газета! // Кобрынскі веснік. - 2009. - 14 кастрычніка. - С. 1-3.

**С наградой**, коллеги! // Заря. - 2009. - 29 сентября. - С. 2.

70 лет со дня выхода первого номера Кобрінской районной газеты.

**Ужо 9000**! // Кобрынскі веснік. - 2009. - 24 студзеня. - С. 1.

24 студзеня выйшаў 9000-ны нумар газеты "Кобрынскі веснік".

**Жук, Е.** Пусть всегда будет "районка" / Елена Жук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 3 мая. - С. 1.

**Квартальная, И.** Влюблённая в журналистику / Ирина Квартальная // Кобрынскі веснік. - 2008. - 15 кастрычніка. - С. 3.

О журналисте газеты "Кобрынскі веснік", ветеране труда М. Хильчук.

**Мельнік, Р.** Іван Дабрагост: "Ва ўсіх абставінах заставацца чалавекам" / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2008. - 17 верасня. - С. 4.

Аб журналісту газеты "Кобрынскі веснік", ветэрану працы І. Дабрагосту.

**Хильчук, М.** Уроки Петра Домбровского / Мария Хильчук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 10 верасня. - С. 4.

О ветеране журналистики районной газеты "Кобрынскі веснік" П. Домбровском.

**Як газетнае** слова адгукнецца? // Народная трыбуна. - 2007. - 1 снежня. - С. 3.

На базе рэдакцыі газеты "Кобрынскі веснік" прайшла творчая нарада журналістаў Брэстчыны.

**С днем** рождения, «районка»! // Кобрынскі веснік. – 2004. – 2 кастрычніка. - С. 3.

Газете "Кобрынскі веснік" – 65 лет.

**Оставайтесь** с нами // Кобрынскі веснік. – 2002. – 6 красавіка. - С. 1.

На должность редактора газеты "Кобрынскі веснік" назначена Елена Жук.

**Нашай** газеце 60 гадоў // Кобрынскі веснік. – 1999. – 6 кастрычніка.

**З гісторыі** газеты // Камуністычная праца. – 1989. – 26 верасня.

Кобрынскай раённай газеце – 50 год (1939-1989).

**Сідарук, П**. Нас вучыла газета / П. Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1979. – 27 верасня.

Кобрынскі раён
Кобрын
Газета «Кобрынскі веснік»
Газеты
Журналісты